РБС-93 – Русско-белорусский словарь: В 3 т. / АН Беларуси, Ин-т языкознания
Я.Коласа. – 4-е изд., испр. и доп. – Минск: БелЭн, 1993. Т. 1–3.
РКС-24 – Ластоўскі В. Падручны расійска-крыўскі слоўнік. – Коўна: Друк. А.Б
1924. – 832 с.
ТСБЛМ – Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы / Пад р
М.Р.Судніка, М.Н.Крыўко; Акад. навук Беларусі, Ін-т мовазнаўства
Я.Коласа. – 2-е выд., дапрац і дап. – Мінск: БелЭн, 1999. – 783 с.
ТСБМ – Тлумачальны слоўнік беларускай мовы: У 5 т. / Пад агул. рэд. а
К.Крапівы. – Мінск: БелСЭ, 1977–1982. Т. 1–5.
ТСВЯ – Даль В. Толковый словарь живого великорусского языка: В 4т. – М.: Русс
язык, 1978–1980. Т. 1–4.
ТСРЯ – Толковый словарь русского языка: В 4 т. / Под ред. Д.Н.Ушакова. – М.: ОГ
1935–1940. Т. 1– 4.

***Д. В. Дзятко (Мін***

# ПОЛІМАРФІЗМ
# У БЕЛАРУСКАЙ МАТЭМАТЫЧНАЙ ТЭРМІНАЛОГІІ

0. Увесь механізм мовы, як справядліва адзначае Ф. дэ Сасі грунтуецца выключна на тоеснасцях і адрозненнях [2, с. 109]. Тэрміна межах тэрмінасістэмы ўласцівы парадыгматычныя сувязі раўназначна набліжанага і апазіцыйнага характару. У гэтай працы даследуецца перш тып сувязей, які ў тэрміназнаўстве называецца сінаніміяй *vs.* дублетнасц *vs.* варыянтнасцю. Мы кваліфікуем адзінкі, што адносяцца да адн дэнатата, але адрозніваюцца фармальна, як **паліморфныя намінац** Яны характарызуюцца: а) семантычнай эквівалентнасцю і агульнасц семантычнай функцыі ва ўсіх кантэкстах; б) аднатыпнасцю а рознаструктурнасцю (рознаўзроўневасцю) фармальнага выражэн в) узаемазамяняльнасцю, якая выступае не ў якасці абавязковай умовы як аптымальны вынік існавання паліморфных найменняў.

Семантычна суадносныя рознаструктурныя тэрміны могуць бы вынікам экстэрнальнага, анамасіялагічнага і лексемнага полімарфізму.

1. **Экстэрнальны полімарфізм** (ад англ. *external* 'знешні') звязан праяўленнем ізафункцыянальных і ізаструктурных уласцівасцей мо якія не парушаюць тоеснасці моўнай адзінкі самой сабе і не выклікаюц тэрміне семантычна-паняційных (унутраных) зрухаў [3, с. 192]. У ме экстэрнальнага полімарфізму можна вылучыць тры асноўныя падтыпы фаналагічны, акцэнталагічны і граматычны полімарфізм.

Фаналагічны полімарфізм прадстаўлены фармальнымі рэалізацыі тэрміна, тоеснымі па марфемным складзе і граматычнай характарысты У беларускай матэматычнай тэрміналогіі ўзнікненне больша фаналагічных паліморфаў абумоўлена суіснаваннем у межах асобн



храналагічных перыядаў розных падыходаў да адаптацыі запазычаных адзінак: *апафема* – *апатэма*, *верзар* – *версар*, *эксцэнтрысітэт* – *эксцэнтрыцытэт* і мн. інш.

Для акцэнталагічнага полімарфізму ўласціва перамяшчэнне націску ў межах лексемы. Прыналежнасцю да гэтага падтыпу полімарфізму могуць характарызавацца тэрміны-субстантывы і тэрміны-ад'ектывы як з вытворнымі, так і з невытворнымі асновамі. Вылучаецца 5 асноўных мадэлей: корань↔корань: *парабала* – *парабóля*, *працэнт* – *прóцант*; корань↔суфікс: *вóсевы* – *васёвы*; корань↔флексія: *вывóдная* – *вывадная*; суфікс↔флексія: *гульнёвы* – *гульнявы́*; прэфікс↔суфікс: *выбаркавы* – *выбаркóвы* і інш.

Граматычны полімарфізм уласцівы толькі асобным, пераважна запазычаным, тэрмінам, якія могуць мець розныя паказальнікі дыферэнцыяцыі роду: *дэтэрмінант* (м. р.) – *дэтэрмінанта* (ж. р.), *прастор* (м. р.) – *прастора* (ж. р.), *эліпс* (м. р.) – *эліпса* (ж. р.).

2. Для **анамасіялагічнага полімарфізму** характэрна ўказанне на ступень праяўлення той ці іншай уласцівасці дэнатата, якое рэалізуецца праз частковае або поўнае змяненне структуры тэрміна. У межах анамасіялагічнага тыпу полімарфізму адрозніваюцца афіксальны, кампазітны, сінтаксічны і квантытатыўны падтыпы.

У беларускай лінгвістычнай традыцыі тэрміны, якія адрозніваюцца афіксальна, прынята, як правіла, адносіць да словаўтваральных (марфалагічных) варыянтаў (сінонімаў). Аднак нам падаецца, што суадносныя пары патэнцыяльна словаўтваральных афіксаў пры тоесных каранёвых марфемах не заўсёды з'яўляюцца дэрыватарамі, бо адпаведныя тэрмінаадзінкі могуць быць утвораны з дапамогай розных спосабаў і ўзыходзіць да розных асноў. Таму, на наш погляд, для абазначэння намінацый, якія называюць адно і тое ж паняцце і не супадаюць марфемным складам, але пры гэтым належаць да аднаго лексіка-граматычнага класа, мэтазгодна выкарыстоўваць тэрмін «афіксальныя паліморфы». Афіксальны полімарфізм прадстаўлены трыма падтыпамі – суфіксальным, прэфіксальным і гібрыдным. Суфіксальны полімарфізм характарызуецца карэляцыяй суфіксаў (або іх спалучэнняў): *-а- / -ва-*: *абмяранне* – *абмерванне*; *-нік- / -ы-цель-*: ***множнік*** – ***множыцель***; *-ø- / -а-нн-*: *уклад* – *укладанне*; *-н- / -а-льн-*: *абарочны* – *абарачальны*; *-оў-ва-льн- / -оўн-*: *апраксімоўвальны* – *апраксімоўны*; *-льн- / -юч-*: *спадальны* – *спадаючы*. Некалькі менш пашыраны лексемы з карэлявальнымі прыстаўкамі або іх спалучэннямі: *аб- / вы- / па- / сыз-*: ***вымер*** – ***абмер*** – *памер* – *сызмер*; *да- / с- / ус-*: ***дапаможны*** – ***спаможны*** – ***успаможны***; *аба- / ад- / па-*: ***абазначыць*** – ***адзначыць*** – ***пазначыць***. Паняцце «гібрыдны афіксальны полімарфізм» уводзіцца намі для намінацыі адрозненняў

паміж тэрмінамі тыпу *паверхня* і *вярхніна*. Тэрмін *паверхня* ўтварыўся з дапамогай тэрміналагізацыі агульнаўжывальнай лексемы, якая, у свайго чаргу, была ўтворана канфіксальным спосабам (***па-+-н-***) ад субстантыва *верх*, а спецыяльнае найменне *вярхніна*, як нам падаецца, узыходзіць да слова *верхні*, ад якога яно ўтварылася з дапамогай суфікса ***-ін-***. Фіксуецца шэраг разнавіднасцей гібрыднага афіксальнага полімарфізму. Прывядзём толькі некаторыя: *вы-+-енн- / па-+-к-*: ***выпраўленне – папраўка***; *у-+-енн- / -а-нн-*: ***ураўненне – раўнанне***.

Адлюстраванне ў сферы кадыфікацыі суфіксальных, прэфіксальных і гібрыдных паліморфных структур, безумоўна, сведчыць пра няўстойлівасць асобных намінацый у складзе матэматычнай тэрмінасістэмы на пэўным гістарычным этапе яе існавання. Адсутнасць адзінапрынятых грамадствам лексем для абазначэння асобных матэматычных паняццяў або розныя экстралінгвістычныя арыенціры вымушаюць спецыялістаў рэалізоўваць альтэрнатыўныя падыходы да ўтварэння тэрмінаў, выкарыстоўваць розныя ўтваральныя асновы і дэрыватары, што з цягам часу прыводзіць да павелічэння колькасці паліморфных адзінак.

Кампазітны полімарфізм вызначаецца канкурэнцыяй паміж суадноснымі запазычанымі і ўласнамоўнымі часткамі складаных тэрмінаў. У адносінах канкурэнцыі могуць знаходзіцца: першыя часткі кампазітаў: ***семіінварыянт*** – ***паўінварыянт***, ***мнагаварыянтнасць*** – ***шматварыянтнасць***; апошнія часткі тэрмінаў-кампазітаў: ***аднапаласцевы*** – ***аднапусткавы***, ***мнагачлен*** – ***мнагасклад***. Кампазітны полімарфізм з'яўляецца заканамерным вынікам лексемнага полімарфізму (гл. ніжэй), рэалізаваным у сферы дэрывацыі.

Сінтаксічны полімарфізм характарызуецца канкурэнцыяй дзвюх або больш суадносных намінацый (ці іх частак), кожная з якіх з'яўляецца комплексным тэрмінам. У беларускай матэматычнай тэрміналогіі функцыянуюць 7 умоўных канструкцый, што аб'ядноўваюць каля 40 мадэлей. У сферы фіксацыі найбольш пашырана мадэль Sub←Adj↔Sub←Adj, якая ўключае двухлексемныя найменні з варыянтнымі ад'ектывамі пры стабільным субстантыве: *лік рэчаісны – лік сапраўдны*; *інтэграл сінгулярны – інтэграл неўласцівы*.

Пад тэрмінам «квантытатыўны полімарфізм» мы разумеем суіснаванне поўнай і ўсечанай формаў адной і той жа намінацыі, якое з'яўляецца вынікам факультатыўнага характару аднаго або некалькіх кампанентаў неаднаслоўных тэрмінаў. Скарачэнне фармальнай структуры тэрміна суправаджаецца кандэнсацыяй яго семантыкі. Намі зафіксавана асноўных канструкцыи, у якія ўваходзяць больш за 50 мадэлей. Найбольш пашыраны наступныя мадэлі: Sub←Sub↔Sub: *дыскрымінант*

*мнагаскладаў – дыскрымінант*; (Sub←Sub)←Adj → Sub←Adj: *абалонка вектараў лінейная – абалонка лінейная.*

3. Існаванне ў тэрміналогіі **лексемнага полімарфізму** непасрэдна звязана з рэалізацыяй розных уласцівасцей дэнатата. Да гэтай групы мы адносім аднаслоўныя намінацыі, “тлумачэнні якіх, даведзеныя да ўзроўню семантычных прымітываў, маюць такую перасякальную частку” [1, с. XLIII], якая большая за іх сумарныя адрозненні. У межах даследуемай групы канкурэнтамі могуць быць: тэрміны ўласнамоўнага паходжання: *бязмежнасць – бясконцасць, развязак – рашэнне*; адзінкі іншамоўнага паходжання: *ліміт – рубеж, парадокс – антыномія*; запазычаныя і ўласнамоўныя намінацыі: *асяродак – цэнтр, вызначнік – дэтэрмінант* і інш.

Такім чынам, праведзенае даследаванне паказвае, што полімарфізм намінацыйных адзінак у беларускай матэматычнай тэрміналогіі, як правіла, узнікае ў выніку суіснавання розных падыходаў да рэалізацыі ў мове спецыфічных асаблівасцей дэнатата або можа быць выкліканы ўплывам тэндэнцыі да кампактнасці спецыяльнага наймення. Відавочна, што семантычна любы варыянт аднолькава правільны ў любой пазіцыі, хаця храналагічна функцыянаванне многіх (у першую чаргу, экстэрнальных і афіксальных) паліморфаў нярэдка абмежавана (напрыклад, 1920-мі гадамі). Экстэрнальны, анамасіялагічны або лексемны полімарфізм уласцівы 5,5% спецыяльных найменняў, што хаця і падкрэслівае сістэмныя сувязі паміж асобнымі тэрмінаадзінкамі, але адначасова сведчыць і пра няўстойлівасць асобных намінацый у складзе тэрмінасістэмы.


1. Лингвистическая терминиология словаря // Новый объяснительный словарь русского языка. Третий выпуск / под общ. руковод. Ю.Д.Апресяна. – М.: Языки славянской культуры, 2003. – С. XVIII – XLIX.
2. Соссюр, Ф. де. Курс общей лингвистики / Ф. де Соссюр; под ред. и с прим. Р.О.Шор. – М.: Едиториал УРСС, 2004. – 256 с.
3. Татариинов, В.А. Теория терминоведеиия: в 3 т. / В.А.Татариинов. – М.: Моск. Лицей, 1996. – Т. 1: Теория термииа: история и современиое состояние. – 311 с.



***А. А. Дзячэня (Магілёў)***


## ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ЛЕКСІКА ЯК ТЭРМІНАСІСТЭМА, ЯЕ АДМЕТНАСЦЬ І СПЕЦЫФІКА

Як асобная лексікалагічная катэгорыя грамадска-палітычная тэрмінасістэма істотным чынам адрозніваецца ад вытворчай тэрміналогіі, прафесіяналізмаў і ў пэўнай ступені ад навуковай тэрміналогіі.

Спецыфічнымі рысамі грамадска-палітычнай лексікі (ГПЛ) з’яўляюцца, па-першае, зразумеласць і даступнасць для большасці